Пры падборы песеннага фальклору трэба улічваць не толькі якго яскравасць, мастацкасць і прастату, але і вакальныя магчымасці дзіцячага голасу, асаблівасці яго пабудовы і развіцця.

Шырокая палітра жанраў беларускага фальклору, якая адпавядае узроставым і мастацкім магчымасцям дзяцей, дае уяўленне аб незвычайным багацці беларускага фальклору, спрые развіццю разнастайных мастацкіх задаткаў і здольнасцей дзяцей.

## СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ АМАТАРСКАЙ ХАРАВОЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСІ

Я.М.Рэутовіч

Духоўнае, культурнае жыццё народа разам з іншымі кампанентамі уключае і заняткі творчай дзейнасцю, без якой не магчыма эстэтычнае выхаванне і усебаковае развіццё асобы.

Асноўваючы мастацкую самадзейнасць у педагагічным аспекце, трэба адзначыць, што само гэта паняцце удакладнілася толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, як з'ява новая, якасна адрозніваючаяся ад фальклорнай і аматарскай творчасці у ранейшым паразуменні.

Чым жа адрозніваецца мастацкая самадзейнасць ад фальклорнай і аматарскай дзейнасці?

Перш за усё гэта розніца у тым, што наша мастацкая самадзейнасць нарадзілася і развіваецца, як масавы рух працоўных, у якім ініцыятыва народа падтрымліваецца і накіроўваецца дзяржаўнымі праўсаюзнымі установамі.

Фальклорная ж і аматарская творчасць ажыццяўляецца па ініцыятыве і за матэрыяльныя сродкі саміх удзельнікаў або мецэнатаў (спонсараў).

Адной з галоўных праблем сучаснай харавой творчасці, на наш погляд, з'яўляецца яе фактычны пераход з статусу самадзейнай у аматарскую. Да гэтага часу, так званай перабудовы, аб развіцці мастацкай самадзейнасці клапаціліся дзяржаўныя і праўсаюзныя установы, накіроўваючы яе развіццё і ствараючы неабходныя матэрыяльныя і арганізацыйныя умовы.

Рэспубліканскія і абласныя навукова-метадычныя цэнтры Мі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ністэрства культуры, міжсаюзныя Дамы самадзейнай творчасці прафсаюзаў непасрэдна займаліся арганізацыяй фестываляў, конкурсаў, аглядаў, павышэннем кваліфікацыі кіраўнікоў харавых калектываў і ансамбляў, выданнем метадычных рэкамендацый і рэпертуару, стварэннем вакальна-харавых і фальклорных гурткоў, правядзеннем адкрытых рэпетыцый, заахвочваннем удзельнікаў і мастацкіх кіраўнікоў калектываў.

З свайго боку прафкомы прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і іншых устаноў асігнавалі значныя сродкі на ўдасканальванне матэрыяльнай базы мастацкай самадзейнасці, набыццё музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў, рэквізітаў.

У сучасны момант у сувязі с пераходам культурна-асветных устаноў на гаспадарчы разлік рэспубліканскія і абласныя навукова-метадычныя цэнтры Міністэрства культурыператварылі ў Інстытут праблем культуры, а міжсаюзныя Дамы самадзейнай мастацкай творчасці наогул скасавалі.

Такім чынам усе калектывы мастацкай самадзейнасці апынуліся ў вельмі складаным становішчы. З аднаго боку ім няма каму аказваць метадычную і практычную дапамогу, а з другога – прафсаюзы перасталі фінансаваць набыццё сэнічных касцюмаў, музычных інструментаў, аплату працы кіраўнікоў і канцэртмайстараў, арганізацыю канкрэтных паездак і г.д. Вядома, калі рэпетыцыі творчых калектываў ператвараюцца ў самамэту, гэта не садзейнічае зацікаўленасці самадзейных артыстаў, і яны страчваюць жаданне ўдзельнічаць у мастацкай творчасці.

Аб гэтым красамоўна сведчыць такі факт, што толькі за 1992 год, у параўнанні з 1991 г., колькасць харавых калектываў у Беларусі скарацілася на 10%.

Калі гэты негатыўны працэс тэрмінова не спыніць, то не ў забаве замест нацыянальнага адраджэння ў галіне эстэтычнага выхавання нашага народа сродкамі самадзейнага мастацтва мы атрымаем поўнае і жудаснае яго разбурэнне.

## СПЕЦЫФІЧНЫЯ РЫСЫ РУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ДУМКІ

І.І.Смялянская

Тэрміналагічнае апісанне руху рускай думкі ў XIX стагод-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ